# Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс будзе ўведзены ў прамысловую эксплуатацыю з 1 верасня

Фота з архіва

Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс будзе ўведзены ў прамысловую эксплуатацыю з 1 верасня, паведаміў журналістам дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра (ГІАЦ) Міністэрства адукацыі Юрый Круглік у час мерапрыемства “Лічбавая трансфармацыя сістэмы адукацыі: асноўныя задачы і напрамкі развіцця”, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

“Гэты рэсурс працуе ўжо з 1 студзеня ў тэставым рэжыме. Гэта наш сумесны праект з Нацыянальным інстытутам адукацыі (НІА) і Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі (АПА). ГІАЦ Мінадукацыі забяспечвае тэхнічнае суправаджэнне і распрацоўку рэсурсу, а вось яго напаўненне навучальнымі матэрыяламі – гэта ўжо нашы калегі з НІА і АПА. З 1 верасня гэты рэсурс пачне працаваць на поўную моц. Мы правялі пэўны комплекс работ, звязаных з рэдызайнам сайта, распрацавалі дадаткова раздзелы”, – расказаў Юрый Круглік.

Паводле яго слоў, на сёння рэсурсам можа скарыстацца любы навучэнец. “Выбраць тэму ўрока, клас, навучальны прадмет або дысцыпліну. Самастойна, калі гэта трэба, вывучыць параграф, прагледзець відэафрагмент, які метадычна вывераны. Распрацоўшчыкамі з’яўляюцца вядучыя настаўнікі Беларусі. Акрамя таго, у частцы кантролю, самаправеркі ведаў прайсці тэст, нават паглядзець, якія адказы былі правільнымі і няправільнымі. Калі ёсць жаданне больш глыбока вывучаць прадмет або тэму, то многія настаўнікі ў нас вядуць свае альбо блогі ў інтэрнэце, альбо інтэрнэт-сайты. У раздзеле

“дадатковыя матэрыялы” ёсць спасылкі на гэтыя блогі або сайты, — адзначыў дырэктар. — Гэта разумны дадатак для таго, каб навучэнец мог ліквідаваць прабелы, якія ў яго ёсць па той ці іншай тэме”.

Ёсць праграма развіцця гэтага рэсурсу. “Мы не стаім на месцы. Ён тэхнічна і тэхналагічна будзе змяняцца. Ужо ёсць на гэта адпаведнае тэхнічнае заданне”, — падкрэсліў Юрый Круглік.

Мерапрыемства, праводзімае пры падтрымцы ААЦ і Міністэрства адукацыі, павінна стаць эфектыўнай дыялогавай пляцоўкай для абмеркавання актуальных пытанняў лічбавай трансфармацыі сістэмы адукацыі і выпрацоўкі стратэгічных рашэнняў у гэтай сферы. Удзельнічаюць у пасяджэнні прадстаўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, занятых у галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, а таксама сістэмы адукацыі Беларусі з усіх рэгіёнаў краіны.

На пасяджэнні асвятляюцца пытанні абароны інфармацыі, прымянення электроннага лічбавага подпісу ва ўстановах адукацыі, актуальных IT-рашэнняў у названай сферы, а таксама іншыя пытанні па тэматыцы пляцоўкі. У прыватнасці, прэзентаваны Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс, які створаны для падтрымкі навучэнцаў пры арганізацыі дыстанцыйнага навучання. Гэты рэсурс дапаможа ў вывучэнні матэрыялу па ўсіх вучэбных дысцыплінах.

Таксама ўдзельнікі абмяркуюць адзін з важнейшых кампанентаў лічбавізацыі сферы адукацыі — стварэнне рэспубліканскага інфармацыйнага адукацыйнага асяроддзя. Паспяховая і своечасовая рэалізацыя праекта мае вялікае значэнне для далейшага развіцця адукацыі ў Беларусі.

БЕЛТА